УДК 329(476)

**Дзейнасць масонскіх арганізацый на беларуска-літоўскіх землях у пачатку ХХ ст.**

Багалейша С.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Гісторыя масонскіх ложаў і іх роля ў развіцці нацыянальнай ідэі і нацыянальнага адраджэння пакуль нячаста была аб’ектам ўвагі беларускіх даследчыкаў. Непасрэднае дачыненне да віленскага масонства мелі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху: браты А. і І Луцкевічы, В. Ластоўскі, І. Краскоўскі і інш. У масонскіх арганізацыях былі прадстаўлены ўсе асноўныя палітычныя плыні краю, незалежна ад іх нацыянальнай арыянтацыі. Галоўнай крыніцай па вывучэнню дзейнасці масонскіх ложаў Віленшчыны з’яўляецца дзеннік Міхаіла Ромера (1880-1945), вядомага навукоўца, публіцыста і палітычнага дзеяча як “гістарычнай” так і “этнаграфічнай”Літвы, які быў прыкметнай постаццю ў мясцовай масонскай іерархіі і гэты бок ягонага жыцця і дзейнасці знайшоў адлюстраванне ў яго дзеннікавых запісах. Масонскія арганізацыі на беларуска-літоўскіх землях былі формай існавання нелегальных дэмакратычных таварыстваў краёвага накірунку, якія ў сваёй палітычнай і грамадскай дзейнасці выступалі з нацыянальна-культурных, рэлігійных і эканамічных інтарэсаў беларуска-літоўскага краю.

У 1910 г. у Вільна ўзнікла першая (краёвая) ложа “Лучнасць”. Сярод ініцыятараў яе ўтварэння былі браты А. і І. Луцкевічы. Узначаліў ложу дзеяч яўрэйскага нацыянальнага руху Ежы Ром. Акрамя іх “братамі” ложы былі І. Красоўскі, З. Нагродскі, Б. Крыжаноўскі, В. Абрамовіч, І Прозараў, Э. Ром, Брамсан і Д. Малінаўскас. У “Лучнасці” былі прадстаўлены ўсе асноўныя этнасы беларуска-літоўскага краю. У палітычным плане масоны выступалі за ўстанаўленне парламенцкай рэспублікі і аўтаноміі “гістарычнай Літвы” у межах дэмакратычнай, федэратыўнай Расіі. У 1911 г. пачала дзейнічасць ложа “Літва”, якую. Ложу узначаліў М.Ромер. У яе склад увaходзілі А. Луцкевіч, а з 1912 г. – В. Ластоўскі. У кастрычніку 1914 г. ў Вільні была створана ложа “Беларусь”. У яе склад увайшлі А.Луцкевіч, А. Булёта, П. Бугайлішкіс, М. Біржышка і інш. Пэўнае арганізацыйнае афармленне ложы намячалася на восень 1915 г., аднак вайна ўнесла пэўныя карэктывы ў гэтыя планы.

Масоны адыгралі важную ролю ў развіцці і пашырэнні нацыянальнай ідэі, барацьбе з існуючым рэжымам, прапагандавалі ідэю этнічнай талерантнасці і былі супраць этнічнага шавінізму. Дзейнасць ложаў была непарыўна звязана з нацыяналь-вызваленчым рухам у Літве і Беларусі.